Інстытут гісторыі НАН Беларусі

---

ЗАПРАШАЕ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У

**Круглым стале**

**«Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст.»,**

**прысвечаным 75-годдзю Валянціны Васільеўны Яноўскай**

Круглы стол ладзіцца з нагоды юбілею выбітнага беларускага гісторыка, былога кіраўніка розных структурных падраздзяленняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдата гістарычных навук, дацэнта Валянціны Васільеўны Яноўскай. Тэматыка круглага стала акцэнтуе ўвагу на пытаннях гіторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст., перыяду, вывучэнню якога Валянціна Васільеўна прысвяціла большую частку свайго прафесійнага шляху.

***Праблемнае поле круглага стала:***

1. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст.: праблемы, здабыткі, перспектывы.
2. Крыніцы па гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст.: відавае багацце і інфармацыйныя магчымасці.
3. Сацыяльна-эканамічныя трансфармацыі канца XVIII — пачатку XX ст.
4. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі (канец XVIII — пачатак XX ст.).
5. Канфесійная сітуацыя на беларускіх землях у канцы XVIII — пачатку XX ст.
6. Матэрыяльная і духоўная культура перыяду.

**Час правядзення круглага стала:** 30 мая 2024 г.
**Месца правядзення:** г. Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі.
**Рабочыя мовы:** беларуская, руская.

Заяўкі на ўдзел у круглым стале прымаюцца па электроннай пошце histbel1820@gmail.com **да 30 красавіка 2024 г**. У заяўцы паведамляецца імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка, яго вучоная ступень і званне, назва даклада, назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык, яго пасада, кантактны тэлефон, e-mail.

**Звяртаем Вашу ўвагу:**

* Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для выступлення і публікацыі.
* Пацвярджэнне аб удзеле ў круглым стале будзе даслана **да 20 мая 2024 г.**
* Форма ўдзелу ў круглым стале: вочная.
* Матэрыялы выступленняў будуць апублікаваны.

**Патрабаванні да тэкстаў дакладаў:** **да 1 верасня 2024 г.** у аргкамітэт дасылаецца электронны варыянт. Матэрыялы круглага стала плануецца выдаць асобным блокам у «Гістарычна-археалагічным зборніку» (навуковае выданне Інстытута гісторыі). З афармленнем і патрабаваннямі можна пазнаёміцца па спасылцы https://history.by/hac/ (Правілы для аўтараў).

**Кантакты:** Сакольчык Алена Эдвардаўна, 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Тэл. (+375 17) 378-18-39, факс (+375 17) 379-18-34, e-mail: histbel1820@gmail.com.

***Камандзіровачныя выдаткі за кошт камандзіруючага боку.***